АСОБА І ЧАС

# НАВУМ ГАЛЬПЯРОВІЧ:

## *На шляху да сябе*

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2012

УДК 821.161.3.09+929Гальпяровіч
ББК 83.3(4Беи)
Н15

*Серыя заснавана ў 2008 г.*

Рэдакцыйны савет:
Анатоль Андрэеў, Анатоль Аўруцін, Ліліяна Анцух,
Уладзімір Гніламёдаў, Алесь Карлюкевіч, Алесь Марціновіч,
Валянціна Паліканіна, Міхась Пазнякоў

Укладальнік
Ліліяна Анцух

**Н15** **Навум Гальпяровіч:** На шляху да сябе / уклад. Л. Анцух — Мінск : выдавецтва «Чатыры чвэрці», 2012. — 168 с. : [6] с. іл.

ISBN 978-985-7026-48-7.

Шматграннасць творчай асобы Навума Гальпяровіча выяўляецца ў яго штодзённай дзейнасці. Кіраўнік міжнароднага радыё «Беларусь», заслужаны журналіст Беларускага саюза журналістаў, член праўлення Беларускага фонду культуры, старшыня таварыства «Беларусь — Арменія», старшыня Полацкага зямляцтва ў Мінску... Паэт, празаік, публіцыст, аўтар і вядучы папулярных радыёпраграм, шматлікіх кніжак, што выходзілі ў выдавецтвах краіны...

І ўся гэтая разнастайная дзейнасць прасякнута высокім пачуццём любові да бацькоўскай зямлі, да роднага Полацка, да беларускага слова.

У прадстаўленай кнізе сабраны інтэрв'ю з гэтым цікавым чалавекам, штрыхі да яго творчага партрэта, а таксама артыкулы, навелы, эсэ, успаміны Навума Гальпяровіча, з якімі ён выступаў у беларускім друку.

Кніга зацікавіць многіх: даследчыкаў творчасці аўтара, яго шматлікіх прыхільнікаў, а таксама тых, хто хоча бліжэй пазнаёміцца з асобай аднаго з найбольш яркіх прадстаўнікоў выдатных дзеячаў беларускай культуры.

**УДК 821.161.3.09+929Гальпяровіч**
**ББК 83.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-7026-48-7**

© Анцух Л. Укладанне, 2012
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва «Чатыры чвэрці»», 2012

# НА ШЛЯХУ ДА СЯБЕ

Наш прыгарадны пасёлак, які ў Полацку ўсе называлі па-руску «Пітомнік» — ад былой назвы гаспадаркі «Дзяржплодагадавальнік», дзе вырошчвалі і прадавалі арганізацыям і насельніцтву саджанцы пладовых дрэў, знаходзіўся непадалёк ад чыгункі. Па начах, калі я прачынаўся і чуў грукатанне праходзячага састава, на сэрцы станавілася ўтульна і спакойна: значыць, я не адзінокі, значыць, недзе ў вагонах едуць людзі, недзе іх чакаюць яркія прыгожыя станцыі. На цягніку я ўпершыню ездзіў да цёткі ў Гродна, калі мне не было і сямі год, і назаўсёды запомніў радаснае ўзрушэнне, калі сядзіш і глядзіш у вагоннае акно, а міма пралятаюць дрэвы, дамы, людзі...

Наш пасёлак знаходзіўся ў самым канцы 6-га завулка Фрунзе і хутчэй нагадваў звычайную вёску: усе жылі натуральнай гаспадаркай, трымалі свойскую жывёлу, кароў, ураблялі гароды. Была нават канюшня, і мы, малыя, цікавалі за конюхам дзядзькам Буцелем, каб пракаціцца на калёсах па пыльнай вуліцы ці дапамагаць дарослым вазіць снапы з поля.

Непадалёк, напрасткі праз засаджаныя гароднінай саўгасныя палі, можна было патрапіць проста да Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. У гады майго дзяцінства манашак там ужо не было, але цэркаўка святой Еўфрасінні дзейнічала, і людзей у святочныя дні было досыць багата.

Наша дзевятая школа была бліжэй да цэнтра, за пераездам і піўнушкай «Блакітны Дунай». Яна была новая, цагляная, двухпавярховая і ў параўнанні з другой, драўлянай, якая месцілася каля самага манастыра, выглядала сапраўдным палацам. У дадатак, яна ў год, калі я пайшоў у першы клас, была аб'яўлена рускамоўнай, што надавала ёй у вачах нашых «пітомніцкіх» зусім іншы, «гарадскі» імідж. Суседка Юля пайшла ў школу на год раней, і я з цікавасцю назіраў, як яна выводзіла ў сшытку беларускія «і» і «ў».

Маю першую настаўніцу звалі Тамара Фёдараўна. Яна была маладая, прыгожая, толькі што пасля педвучылішча, і мы для яе былі таксама першымі вучнямі. З Тамарай Фёдараўнай лёс звязаў нас на доўгія гады: яна, студэнтка-завочніца, разам з намі «перайшла» ў пяты клас і была класным кіраўніком для большасці маіх аднакласнікаў аж да апошняга, адзінаццатага. Ды і потым была жаданай госцяй на вяселлях і хрэсьбінах, а мы, ужо дарослыя, запраста заходзілі на госці ў яе ўтульную кватэру, дзе разам з ёй радаваўся нашаму прыходу яе муж, дзядзя Вадзім, якога ўжо, на жаль, няма на гэтым свеце.

Чытаць я навучыўся яшчэ да школы. Навучыў бацька. Былы франтавік, без рукі, ён не быў надта адукаваны. Старэйшы са шматдзетнай рабочай сям'і, ён скончыў сем класаў школы і адзін курс Магілёўскага будаўнічага тэхнікума, да вайны быў печнікам, а пасля вяртання з фронту працаваў на самых розных работах, закончыўшы працоўную кар'еру вартаўніком. Мама ж пасля рабфаку паступіла ў Ленінградскі педінстытут імя Герцэна. Там жа, у Ленінградзе, трапіла ў блакаду, ледзь выжыла і пасля вяртання на родную Віцебшчыну ўвесь свой працоўны шлях звязала з нашай прыгараднай гаспадаркай. Па сутнасці, яна была галоўным кармільцам сям'і, у якой разам з бацькам і маёй малодшай сястрой жылі бабуля і мой стрыечны брат сірата Сямён, які потым стаў марскім афіцэрам. Гэта дзякуючы ёй у нас была кватэра, гарод, штогод выдзялялі сорак сотак пад бульбу. Мы трымалі карову, курэй і жылі па тых мерках не сказаць каб заможна, але і не бедна.

Першыя свае радкі я напісаў у чацвёртым класе. Два так званыя вершы. Адзін на беларускай мове, другі — на рускай. Шчыра кажучы, вельмі хацелася надрукавацца, убачыць сваё прозвішча ў газеце. Адзін «верш» паслаў у газету «Зорька», другі — у «Піянер Беларусі».

Адказы прыйшлі амаль адначасова. У іх літкансультанты Міхась Герчык і Яўген Курто раілі больш чытаць харошай

літаратуры, уважліва ставіцца да слова. Так што першы блін выйшаў комам.

Пацiху прага мая да вершатворчасцi спынiлася. Праўда, была яшчэ перапіска з Маршаком, дакладней, не перапіска, а мой ліст з «вершам» і яго добразычлівы адказ, але пра гэта я напісаў у навеле «Ліст Маршаку». А так я быў захапіўся футболам, і хаця кніжак чытаў па-ранейшаму шмат, вершаскладаннем займаўся пацiху i толькi для сябе. Пісаў у асноўным пра каханне, балазе, аб'ектаў, каму ў думках прысвячаліся радкі, хапала.

Аднойчы, калі вучыўся ўжо ў адзінаццатым класе, ішлі мы пасля школы дахаты з сябрам і аднакласнікам Сашам Канавалавым, і раптам ён прызнаўся, што піша вершы. І нават даў пачытаць. Я таксама пазнаёміў яго са сваімі радкамі. Мы дамовіліся пайсці на пасяджэнне літаб'яднання «Наддзвінне» пры газеце «Сцяг камунізму». З гэтым літаб'яднаннем потым надоўга нас звяжа лёс. Як і з літаб'яднаннем «Крыніцы» пры наваполацкай гарадской газеце «Химик». Менавіта ў «Химику» адбыўся мой дэбют. Памятаю, як хваляваўся, як трымцела ўсё ў душы, калі Алесь Шпыркоў, які быў тады намеснікам галоўнага рэдактара, чытаў уголас гэты верш на пасяджэнні літаб'яднання, як Валянцін Лукша, тадышні кіраўнік «Крыніц», вымавіў: «А што, нічога... »

Першая вялікая падборка вершаў з'явілася ў тым жа «Химику», калі я працаваў грузчыкам на полацкім заводзе шкловалакна. Праца была пазменная, і аднойчы, калі трэба было ехаць на пасяджэнне літаб'яднання, мне выпала працаваць з шасці вечара. А пабываць на літаб'яднанні вельмі хацелася. Я нават дамовіўся, каб мяне замяніў наш новы грузчык, які павінен быў працаваць у іншую змену. Але начальнік цэха, дарэчы, бацька маёй аднакласніцы, не адпусціў. Бачачы мой настрой, начальніца змены Зінаіда Ігнацьеўна Кузьменка, калі начальнік цэха пайшоў, сказала:

— Едзь, Навум, на сваё літаб’яднанне. Станеш пісьменнікам, успомніш пра мяне.

Так што яе пажаданне з радасцю выконваю.

Праз хуткі час мне пашчасціла пабываць на семінары творчай моладзі Віцебшчыны. Адным з кіраўнікoм яго быў ужо вядомы паэт Давід Сімановіч. Сярод удзельнікаў былі Леанід Дайнека, Леанід Главацкі, Барыс Беліжэнка, Пятро Ламан, Анатоль Канапелька, Ала Красінская, Марыя Баравік, Алег Салтук, якія ўжо друкаваліся і на старонках «Віцебскага рабочага», і ў рэспубліканскім друку. Там я нечакана для сябе стаў лаўрэатам абласнога конкурсу маладой паэзіі, які аб’яўляў абкам камсамола, і атрымаў пуцёўку на рэспубліканскі семінар маладых літаратараў у Каралішчавічах.

Ніколі не забуду тыя дзесяць снежаньскіх дзён!.. Знаёмства з Алесем Разанавым, Лёняй Якубовічам, Віктарам Ярацам, Яўгенам Хвалеем, Васілём Шырко, Алесем Крыгам, Нінай Шклярavай... Семінарскія заняткі вялі Уладзімір Адамчык, Васіль Зуёнак, Пятрусь Макаль, Раман Тармола... Кіраўніком семінара, нашым пастаянным «дзядзькам» быў Тарас Хадкевіч. А на завяршальны вечар прыехалі Іван Шамякін, Васіль Быкаў, Янка Брыль. Менавіта там, у Каралішчавічах, я зразумеў, што быць пісьменнікам не проста, што трэба моцна любіць Радзіму, яе мову, што літаратура — гэта не толькі сур’ёзны занятак, гэта самаахвярнае служэнне, боль і радасць, трагедыя і шчасце.

Першыя вершы на беларускай мове я паслаў у часопіс «Маладосць», куды да таго часу перабраўся Леанід Мартынавіч Дайнека. Я і раней пісаў па-беларуску пад уздзеяннем сяброў-літаратараў Івана Стадольніка, Міхася Губернатарава, але друкаваць іх чамусьці саромеўся. Пра тое, як да мяне з такой жа парадай у рэдакцыі ленінградскага часопіса «Нева» звяртаўся адзін з класікаў рускай паэзіі Усевалад Раждзественскі, я падрабязна напісаў у адным

з апавяданняў, дарэчы, перакладзеным і надрукаваным у санкт-пецярбургскім альманаху «Невский меридиан».

«Хросным бацькам» для мяне, як і для многіх, стаў Мікола Якаўлевіч Аўрамчык. Тая першая падборка ў «Маладосці» і зараз захоўваецца ў маім архіве.

Жыццё ішло, я вучыўся, працаваў у полацкай газеце разам з будучымі пісьменнікамі Іванам Стадольнікам і Германам Кірылавым, друкаваўся ў «Маладосці», «ЛіМе», «Беларусі», ездзіў на семінары. Ды нешта не задавальняла мяне ва ўласнай творчасці, нейкай іскры не было. Аж пакуль не пераехаў у Наваполацк, не стаў актыўным сябрам літаб'яднання «Крыніцы». Сёння прозвішчы тадышніх «крынічан» добра вядомыя не толькі ў Беларусі. На жаль, па розных прычынах творчыя і жыццёвыя шляхі нашы разышліся, але я ніколі не забудуся на тую цудоўную атмасферу сяброўства, творчага гарэння, якая панавала тады ў «Крыніцах». Згадаю толькі хіба Міхася Барэйшу, які заўчасна пайшоў з жыцця  дваццаць гадоў таму і з якім мяне звязвала шчырае сяброўства. Мы разам падавалі дакументы ў Саюз пісьменнікаў, адзін час разам працавалі ў аб'яднанні «Палімір», ён прыйшоў працаваць на маё месца ў полацкую газету... Талент яго не паспеў раскрыцца напоўніцу, але ён застаўся сваімі творамі ў нашай літаратуры. На літаб'яднанні хадзілі мастакі Сяргей і Рыта Цімохавы, рок-музыканты Алег Паўлёнак і Сяргей Анішчанка, загадчыца аддзела культуры Людміла Касьянава, студэнты Іна Снарская і Сяргей Красоўскі... Рады, што ўсе «крынічане» верна служаць роднаму беларускаму слову, раскрылі свой творчы патэнцыял і, дай Бог, яшчэ нямала зробяць добрага ў літаратуры.

Першая мая кніжка выйшла ў 1983 годзе, дакладней, гэта быў калектыўны зборнік «Сцяжына». Трапіў я туды, таму што згубіўся рукапіс самастойнай кнігі, і трэба было, што называецца, ускочыць у апошні вагон. Дарэчы, такі

ж лёс напаткаў і зборнік для «Бібліятэчкі “Маладосці”», і справядлівасць аднавіў Уладзімір Саламаха, ужо калі я працаваў у Саюзе пісьменнікаў.

Самастойнай кнігі давялося чакаць яшчэ сем гадоў. У 1990 годзе выйшла кніга «Брама». Вокладку для яе намаляваў Валодзя Сцяпан, за што я яму ўдзячны. На ёй выява Сафійскага сабора. У кнізе шмат вершаў прысвечана майму роднаму Полацку. Менавіта мой горад, усведамленне яго велічы, шматпакутнай гісторыі роднага краю і сталі для мяне асноўным матывам творчасці, як і роздум пра сённяшні дзень, высокія матывы любові і кахання. Затым былі кнігі «Востраў душы», «Струна».

А ў 1997 годзе я ўжо амаль у пяцідзесяцігадовым узросце пераехаў у сталіцу.

Працаваў спачатку ў «Вожыку», а затым, зусім нечакана, мяне абралі намеснікам старшыні Саюза пісьменнікаў. Гэта было вельмі адказна і хвалююча: штодня сустракацца з вядомымі нашымі творцамі, вырашаць надзённыя пытанні пісьменніцкай арганізацыі. Часта сустракаўся з Іванам Пятровічам Шамякіным, які цікавіўся жыццём Саюза, шмат дапамагаў у вырашэнні складаных пытанняў. На жаль, амбіцыі, супрацьстаянне, залішняя палітызацыя паступова вялі арганізацыю да таго расколу, які адбыўся. Але гэта здарылася ўжо пры іншым кіраўніцтве. У 2002 годзе я вярнуўся на роднае Беларускае радыё і ў 2004 годзе ўзначаліў радыёстанцыю «Беларусь».

У Мінску ў мяне выйшлі кнігі паэзіі і прозы «Святло ў акне», «Шляхі і вяртанні», «Голас і рэха», «Гэта ўсё для цябе», «Насцеж». У Мінску мне пашчасціла спазнаць святло і цяпло сапраўднага вернага сяброўства з Алесем Пісьмянковым, страту якога да гэтага часу перажываю як найвялікшае ўласнае гора. І заўсёды са мной быў мой родны Полацк, які па-ранейшаму адзін з галоўных чыннікаў майго духоўнага жыцця:

*Ратаваннем ад нематы*
*Я свой лёс назаўжды прыдумаў,*
*Беларускай душы матыў*
*Тут з біблейскім мяжуе сумам.*

*Бо адкуль даўні продак мой:*
*З Віфлеему ці Назарэту?..*
*Родны горад мой над Дзвіной,*
*Разгадаў ты загадку гэту.*

*Я адсюль праз гады пранёс*
*Ціхі вечар і ранак сіні,*
*Палатоўскі пясчаны плёс*
*Каля цэркаўкі Еўфрасінні.*

*Мой пачатак і мой выток,*
*Дзе і шчасце маё, і гора...*
*Я ад дрэва твайго лісток,*
*Залаты мой спрадвечны горад.*

*Мы з табою даўно на «ты».*
*І пачуў ты, як напрадвесні*
*Беларускай душы матыў*
*Стаў працягам адвечнай песні.*

Спадзяюся, што шлях яшчэ працягваецца, што лепшага яшчэ не напісаў, што яшчэ шмат трэба зрабіць для роднага слова, для зямлі, што нам дадзена лёсам.

# МУЖЧЫНСКІ ПОГЛЯД

## Навум Гальпяровіч: журналіст, пісьменнік і дырэктар

*Гутарыла Святлана Дзянісава*

Голас Навума Гальпяровіча можна чуць штотыдзень у нядзелю а дзевятай вечара на першым канале Беларускага радыё ў перадачы з салодка-шчымлівай назвай «Зямля, што нам дадзена лёсам». Яго вершы склаліся ў кнігі паэзіі з найменнямі то сціплымі, то ўзнёслымі, адначасова будзённымі і велічнымі, адкрытымі і з таемным сэнсам: «Сцяжына», «Брама», «Востраў душы», «Струна», «Святло ў акне», «Гэта ўсё для цябе», «Голас і рэха», «Насцеж». Яго апавяданні хочацца перачытваць, таму што ад іх робіцца хораша на сэрцы. Навум Якаўлевіч Гальпяровіч — галоўны дырэктар радыёстанцыі «Беларусь», але гэта афіцыйна. Кажучы прасцей, ён самы цікавы суразмоўца з усіх, з кім мне даводзілася гаварыць пра жыццё…

**— Навум Якаўлевіч, якім вы былі хлопчыкам, аб чым марылі?**

— Як любы хлопчык свайго часу, я хацеў быць капітанам далёкага плавання. Ну, канешне, трошкі марыў аб акцёрстве. Я займаўся ў драматычным гуртку пры Доме піянераў, іграў Вішаньку ў спектаклі «Чыпаліна». І нават нейкая камісія з Мінска дужа мяне хваліла за акцёрскія здольнасці, але я падсвядома разумеў, што хлопчыку з полацкай ускраіны цяжка будзе стаць акцёрам. А чаму мне хацелася быць акцёрам? Таму што можна было на сябе прымерыць самыя розныя жыцці. Сёння можна быць капітанам далёкага плавання, заўтра — генералам, паслязаўтра — партызанам, а там — яшчэ кімсьці. Мне хацелася пабыць самымі рознымі людзьмі, паспрабаваць зрабіцца чалавекам з той сферы, якая мне мала вядома.

А яшчэ мяне вабілі розныя краіны, бо я любіў чытаць, вельмі любіў. Падарожнічаць па свеце — гэта так рамантычна, цікава, думаў я і таму палічыў, што быць капітанам далёкага плавання — самае тое. А потым мама падарыла мне кніжку «Морские рассказы», там было апавяданне «Максимка» пра чарнаскурага юнгу, маленькага хлопчыка, якога любілі ўсе матросы. Пад уражаннем я нават са сваім аднакласнікам Валодзем Казловым пасварыўся. Ён сказаў: «Ты будзеш пісьменнікам ці журналістам, а ніякім капітанам не будзеш». Я раззлаваўся і кажу: «Давай паспрачаемся, хадзем да Тамары Фёдараўны». І мая настаўніца Тамара Фёдараўна нам адказвае: «Так, у Навума здольнасці ёсць, ён будзе пісьменнікам і журналістам». У мяне былі яшчэ два сябры, вельмі блізкія мне і дарагія: Саша Канавалаў, ён цяпер мастак, і Валодзя Варпаховіч, дзядзя Том, як мы яго звалі. Саша мне аднойчы сказаў, што напісаў верш. Тады я прызнаўся, што таксама пішу вершы. І дзядзя Том, гледзячы на нас, пачаў пісаць. Мы купілі Вазнясенскага, «Ахиллесово сердце», і такое было ў нас усіх узрушанне ад вершаў гэтага паэта, што мы пачалі хадзіць на літаб'яднанне. Яны не сумняваліся, што будуць журналістамі і паэтамі, а я сумняваўся. Лічыў, што я мала таленавіты для гэтага. І нават калі пачаў пісаць першыя вершы, школьныя яшчэ, таксама ставіўся да гэтага досыць скептычна. Па-першае, часам мне не хацелася іх пісаць, а часам я адчуваў, што ў іх няма нічога такога, што б мне даказвала, што гэта нешта цікавае. Нават пасля першых сваіх публікацый часта задумваўся, ці не голы я кароль.

**— А калі вы пачалі друкавацца?**

— Першая сур'ёзная публікацыя была ў наваполацкай газеце «Химик» у 1967 годзе. Мне зрабілі партрэт і змясцілі падборку вершаў. Гэтую падборку я ў сябе нядаўна знайшоў, прагледзеў, і ведаеце, — неблагія вершы. Вось цяпер я бачу: па гэтай публікацыі можна было ска-

заць, што іх пісаў здольны хлопчык. Потым я друкаваўся ў абласной газеце, нейкая падборка была ў часопісе «Беларусь», але перад сабой, для сумлення свайго я не адчуваў, што гэта цікава, важка, што гэта паэзія. І часта думаў: вось падманваю я людзей, а сам проста ўмею складаць радкі. Але потым надарыўся першы боль, і мне захацелася ўжо не проста напісаць вершы, гэта было ад сапраўднага пачуцця. Тады я зразумеў, што нешта ўва мне ўсё ж ёсць. І калі мяне папрасілі падрыхтаваць сваю біяграфію для энцыклапедыі, я перыяд з 1967-га недзе да 1974-га года выкінуў. Мне супрацоўніца энцыклапедыі кажа: «Вы ж памыліліся». Яна знайшла ў матэрыялах, што мая першая публікацыя была ў 1967 годзе. А я толькі нядаўна трохі прывык, што мяне называюць паэтам. Раней нават уздрыгваў ад гэтага. Калі на вокладцы часопіса «Крыніца», які я вельмі паважаў, аднойчы напісалі «Міхась Стральцоў, Эрнест Хемінгуэй, Навум Гальпяровіч», мяне гэта ўразіла мацней за ўсё. Такія імёны — і маё побач.

**— І ў журналістыку вы трапілі без імкнення, а таму, што не атрымалася нешта іншае?..**

— Так, я паступаў у інстытут замежных моў. Атрымаў «пяцёркі» і «чацвёркі» па ўсіх прадметах, акрамя англійскай мовы. Па англійскай — «траяк». А гэта было ў год, калі дзясятыя і адзінаццатыя класы разам выпускаліся, і было дванаццаць чалавек на месца. Я не паступіў. Мне было сорамна і перад бацькамі, і перад настаўніцай, таму што яна са мной два гады займалася і ганарылася, што я добра ведаю англійскую мову. Мая Іванаўна вучыла не так, як цяпер рэпецітары, за ўсё я ёй заплаціў каробку цукерак і букет кветак. І вось не паступіў. Ну і вырашыў паспрабаваць на факультэт журналістыкі прайсці. Напісаў сачыненне на «пяцёрку», потым другі экзамен — таксама «пяцёрка», і трэці — «пяцёрка». І паступіў. Ну што рабіць, так атрымалася.

**— На радыё вы таксама спачатку не імкнуліся?**

— Так. Хаця тут ёсць нейкая містыка. Я вельмі любіў слухаць казкі па радыё і нават у дзяцінстве ў радыё гуляў. Адкрываў кніжку і гаварыў: «У Мінску шаснаццаць гадзін. Паслухайце, калі ласка, казку». Але гэта была частка той акцёрскай мары, а не мара пра радыё. Так склаўся лёс, што потым я працаваў у полацкай газеце і вельмі хацеў трапіць у сур'ёзную газету ці часопіс. У мяне гэта не атрымлівалася. У мяне ўвогуле ў жыцці столькі не атрымлівалася, што не хопіць пальцаў рук, каб падлічыць, колькі мяне дзесьці не пускалі ці нешта бракавалі. Я часам жартую, як у Райкіна: столькі разоў не лаўрэат і гэтак далей. Некаторыя людзі, напрыклад, мне даказвалі, што ў мяне ніколі не выйдзе кніжка. Многіх раздражняла і раздражняе нейкая мая самастойнасць, а яшчэ маё няўменне гуляць. Я трымаюся заўсёды з пэўнай годнасцю, а гэта многім не даспадобы. Гэта нават выклікае непрыязнь. Не тое што я такі дзёрзкі, але магу дазволіць сабе часам быць на роўных. Таму, дарэчы, у мяне ніколі не было літаратурнага настаўніка. А я так зайздросціў, калі нехта званіў або пісаў лісты да Івана Антонавіча Брыля. Нават Давід Сімановіч, які кіраваў віцебскім літаб'яднаннем, і той даволі прахалодна да мяне адносіўся, не вылучаючы з іншых. А можа, мяне ўсе лічылі самадастатковым? А можа, я сам знешне ці яшчэ як гэтаму перашкаджаў? У выніку атрымлівалася, што мне дапамагаць не ірваліся. А я, як любы творчы чалавек, не мог сядзець на месцы, я кудысьці імкнуўся. І таму стаў прасіцца з полацкай газеты. Мяне тады выклікаў сакратар райкама партыі і кажа: «Можа, табе кватэру даць? Дадзім мы табе кватэру». І я марыў, каб мне не далі кватэру, таму што хацеў рухацца наперад.

Неяк мяне запрасілі ў адну газету, а потым, як заўсёды, адмовілі. Аднакласнік Валодзя Казлоў, які ўжо працаваў на «Паліміры» у парткаме, прапанаваў мне стаць рэ-

## ЗМЕСТ

На шляху да сябе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Мужчынскі погляд. Навум Гальпяровіч: журналіст, пісьменнік і дырэктар *(Інтэрв'ю з С. Дзянісавай)* . . . . . . . . . . . . . . . 10

*Мікола Шабовіч.* «Хай будзе свята...» *(Штрыхі да творчага партрэта Навума Гальпяровіча)* . . . . . . . . . . . 28

Палата́ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46

ПАМІЖ ЦЭНТРАМ І ЎСКРАІНАЙ . . . . . . . . . . . . . . 50

«Пацярпі, сынок…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50

Браты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52

Вернасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56

Пажар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59

НА ПУЛЬСЕ ЧАСУ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62

Ахоўная зона духоўнасці. Аб ролі літаратуры ў сучасным грамадстве . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62

Толькі сэрцам трывожным пачую.
Роздум пісьменніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72

Як нараджаюцца гарады . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77

Мой адрас — Чырвоная, 4
*(Да 85-годдзя Беларускага радыё)* . . . . . . . . . . . . . . 81

Прыклад служэння роднай культуры . . . . . . . . . . . . . 88

Самы высокі паверх . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92

На радзіме легендарнага казачніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100

Кітайскі дзённік, або Падарожжа ў Паднябесную . . . . . . 105

Пад святлом белых начэй. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121

Дзе хлопчык той? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 124

«Наддзвінне» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134

Мулявін . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137

На шчымлівай хвалі ўспамінаў
*(З цыкла «Мы з братам»)*. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142

«Забірайце мяне…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145

АДЛЮСТРАВАННІ *(З дзённікавых запісаў)*. . . . . . . . . . . . . . . 148